# Са святам, дарагія сябры!


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі універсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 16(407) | Субота, 30 красавіка 1960 года | Цана 10 кап.


**Камсамольцы і камсамолкі, савецкая моладзь! Вучыцеся жыць і працаваць па-камуністычнаму! Выпрацоўвайце ў сябе высокія маральныя якасці! Будзьце свядомымі і нястомнымі будаўнікамі камунізма!**

(З Заклікаў ЦК КПСС да свята Першае мая).



Добра працуе ў гэтыя дні на будаўніцтве галоўнага корпуса універсітэта комплексная брыгада муляроў Канстанціна Бука. Стаўшы на перадсвяточную вахту ў гонар Першага мая, яна выконвае дзённыя заданні на 160—175 працэнтаў.

НА ЗДЫМКУ: на будаўніцтве галоўнага корпуса. На пярэднім плане муляр з брыгады Канстанціна Бука Генадзь Пракопчык.

## СВЯТА ВЯСНЫ ЧАЛАВЕЦТВА

ПЕРШАЕ МАЯ... Рэвалюцыйны пралетарыят усяго свету нездарма выбраў гэты дзень для свайго свята — дзень, калі прырода абуджаецца ад сну, на дрэвах распускаюцца пупышкі і ўсюды нястрымна перамагае жыццё. Першае мая — гэта свята братэрства сыноў розных народаў, свята вясны чалавецтва.

Вясна чалавецтва... Так назваў нашу Бацькаўшчыну найвялікшы песняр савецкай эпохі У. У. Маякоўскі. Яшчэ ў часы, калі толькі зрэдку, быццам іскры ў цемры ночы, палымнелі чырвоныя сцягі, тыя, хто клаў на іх дрэўкі свае мазолістыя рукі, верылі ў вясну чалавецтва. І здзейснілася! Народжаная ў баях і працы, яна існуе, яна, быццам маяк, паказвае ўсяму чалавецтву шлях да светлага будучага — да камунізма.

Так. Камунізм цяпер — не прывід, не тэарэтычныя разважанні. Камунізм — гэта рэальнасць, ствараемая нашымі рукамі.

Наш народ, іменна наш, і мы па праву ганарымся гэтым, уступіў у перыяд разгорнутага будаўніцтва камунізма і тым самым аказвае велізарную дапамогу справе будаўніцтва новага жыцця ў краінах усяго сацыялістычнага лагеру. Нашаму народу выпаў гонар першаму пачаць апошні і рашучы бой са старым светам, бой мірнымі сродкамі. Мы не баімся яго. Мы гаворым старому свету: «Давай паспаборнічаем, хто створыць больш матэрыяльных даброт на душу насельніцтва». І мы ўпэўнены—перамога будзе за намі. Залог гэтага — не адна ўжо перамога, што яскрава даказваюць перавагу сацыялістычнага ладу над капіталістычным. Мы першыя запусцілі штучны спадарожнік Зямлі. Першая ракета, якая дасягнула паверхні Месяца, была наша. Наша была і другая ракета, што абагнула Месяц і сфатаграфавала яго нябачны бок. Са стапеляў нашых верфяў сыйшоў першы ў свеце атамны ледакол.

Наш народ з надзеяй глядзіць у будучае. Ен упэўнены, што будуць пабудаваны яшчэ новыя гарады, новыя заводы і фабрыкі, новыя дасканалыя судны будуць разразаць хвалі нашых водных прастораў. Чалавек зменіць твар зямлі, ён пакорыць поўны таямніц Сусвет і паставіць яго сабе на службу. Для гэтага нам трэба толькі адно — мір, мір і мір.

Вясна заўсёды прыносіць з сабой пацяпленне. А сёлета яна прынесла з сабой і пацяпленне ў міжнародных адносінах. Сустрэчы Мікіты Сяргеевіча Хрушчова з прэзідэнтам ЗША Дуайтам Эйзенхауэрам, візіт дружбы ў Інданезію і іншыя краіны Азіі, гутаркі з прэзідэнтам Італіі Гронкі, а затым паездка ў Францыю і перагаворы з дэ Голем — усё гэта толькі вехі ў барацьбе за мірнае суіснаванне, за ўсеагульнае разбраенне і дружбу паміж усімі народамі.

У гэтыя перадсвяточныя дні ў нашым універсітэце закончылася размеркаванне маладых спецыялістаў. Дзесяткі і сотні юнакоў і дзяўчат улюцца ў армію будаўнікоў камунізма, каб з маладым запалам працягваць іх справу. Дзе б яны ні працавалі: у школах, у савецкіх установах, у навукова-даследчых лабараторыях і інстытутах, на заводах і фабрыках — мы верым, яны не зганьбяць гонару нашага універсітэта, які ў рэспубліцы па праву называюць кузняй беларускіх нацыянальных кадраў.

Ну, а тыя, што застаюцца ў сценах універсітэта, таксама сустрэнуць Першае мая новымі поспехамі ў вучобе і грамадскай рабоце.

Нашы дарагія выпускнікі, усе студэнты і супрацоўнікі універсітэта. Хай поспех спадарожнічае Вам ў жыцці і рабоце!

Са святам вас, з Першамаем, таварышы!

## ВЫДАТНЫ ПАЧАТАК

Чацвертакурснікі біялагічнага факультэта экзаменацыйную сесію здаюць на месяц раней — у маі. Гэта і зразумела. Сёлета іх чакае працяглая вытворчая практыка.

Аднак экзамен па жывёлагадоўлі студэнты вырашылі здаць датэрмінова. Група выдатна падрыхтавалася да яго. Кандыдат біялагічных навук Аляксандра Іванаўна Фядоткіна задаволена адказамі студэнтаў — глыбокія, трывалыя веды паказалі яны. З блескам, з грунтоўным веданнем матэрыялу адказвалі Леанід Шкляроў, Галіна Нікіціна, Лера Налівайка, Эла Шушкіна, Галіна Печань, Галіна Душкевіч. 15 выдатных адзнак з 28—зусім нядрэнна для пачатку сесіі.

— Няхай гэтыя адзнакі,— гавораць біёлагі,— будуць нашым сціплым падарункам Першамаю.

**Э. АТРАШКОВА.**

## *Каштоўная ініцыятыва*

Вось ужо трэці год на матфаку існуе матэматычны гурток для школьнікаў. Сёлета ў ім удзельнічае каля 50 чалавек. Заняткі з вучнямі вядуць студэнты і выкладчыкі. Так, студэнт У. Платонаў займаецца з дзесяцікласнікамі. Кандыдат фізіка-матэматычных навук М. Неменман праводзіць заняткі з вучнямі 9 класаў, студэнт У. Воднеў і аспірант А. Навумовіч—з вучнямі 8 класаў.

Па просьбе Міністэрства асветы факультэт арганізаваў алімпіяду школьнікаў Мінска для паездкі на Усесаюзную матэматычную алімпіяду ў Маскву. Сярод пераможцаў рэспубліканскай алімпіяды нямала выхаванцаў матэматычнага гуртка.

Ініцыятыва матэматычнага факультэта вельмі каштоўная. Зусім верагодна, што вучні, якія займаюцца ў гуртку, складуць ядро будучага кантынгента першакурснікаў.

**В. ШЭІН**

## ПАДАРУНКІ ДРУКАРОЎ

З уздымам працуе ў перадмайскія дні калектыў друкарні выдавецтва універсітэта. Калі план І квартала бягучага года быў выкананы на 126 працэнтаў, то красавіцкі план—на 130 працэнтаў.

У сацыялістычным спаборніцтве ў гонар Першага мая ўперадзе ідзе пераплётны цэх, дзе тон у працы задае старэйшы пераплётчык І. А. Карп. Не адстаюць ад яго Зіна Лічко, Надзя Мамчыц, Ліля Пуроўская. У лінатыпістаў стараннай працай вызначаюцца Валя Гайваронская і Наташа Паўлыга. Выдатна працуюць таксама наборшчыкі Ліда Панава і Ганна Семашка, друкары Галіна Мурашкіна і Анатоль Пількевіч.

## *Камсамольская дапамога*

Упершыню ў гэтым годзе на біялагічным факультэце ўведзены курс вышэйшай матэматыкі. Новая для біёлагаў дысцыпліна нялёгка давалася ім. Вось камсамольскае бюро факультэта і звярнулася ў акадэмічны сектар камітэта камсамола з просьбай, няхай матэматыкі наладзяць кансультацыі па вышэйшай матэматыцы для першакурснікаў біяфака.

У акадэмічным сектары камсамольскага бюро матфака ўважліва аднесліся да гэтай просьбы. Бюро для правядзення кансультацый вылучыла лепшых студэнтаў-выдатнікаў вучобы. Усяго было падабрана сем чалавек са студэнтаў III-га і IV-га курсаў.

Першая кансультацыя ўжо адбылася. Праводзілі яе Міхаіл Варын і Пётр Манастырны. Яны высветлілі, што няясна біёлагам, якія цяжкасці яны сустракаюць. Пасля некаторых тэарэтычных указанняў разам прыступілі да рашэння прыкладаў па дыферэнцыяльнаму вылічэнню і тэорыі гранічнасці.

Кансультацыя працягвалася гадзіны дзве і вельмі спадабалася біёлагам. Вырашана, падобныя заняткі праводзіць рэгулярна два разы ў тыдзень.

**Я. ДОСІНА.**

**РАБОТНІКІ НАВУКІ І ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ! ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА ДАЛЕЙШЫ РОСКВІТ НАВУКІ, ЗА ТЭХНІЧНЫ ПРАГРЭС! ЦЯСНЕЙ СУВЯЗЬ З ВЫТВОРЧАСЦЮ! РЫХТУЙЦЕ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ, ВАРТЫХ ЭПОХІ КАМУНІЗМА!**

(З Заклікаў ЦК КПСС да свята Першае мая).

## НОВЫЯ ДАКТАРЫ НАВУК

Напярэдадні свята 1-ае Мая абаранілі доктарскія дысертацыі супрацоўнікі нашага універсітэта П. Ф. Пратасеня і В. І. Сцяпанаў. Доктарскай дысертацыяй П. Ф. Пратасені з'явілася кніга «Паходжанне свядомасці», надрукаваная выдавецтвам БДУ. В. І. Сцяпанаў у якасці доктарскай дысертацыі прадставіў сваё даследаванне «Філасофскія і сацыялагічныя погляды Белінскага».

Крыху раней абараніў доктарскую дысертацыю Г. М. Ліўшыц. Ён прадставіў на абарону дзве работы — «Класавая барацьба ў Іудзеі і паўстанні супраць Рыма» і «Кумранскія рукапісы і іх гістарычнае значэнне».

**С. СЦІПЛОВІЧ.**

## ВЕЧАР ДРУЖБЫ

*Зусім нядаўна ва універсітэце арганізаваўся інтэрнацыянальны клуб. Па яго ініцыятыве ў гонар Міжнароднага дня салідарнасці моладзі ўсіх краін у барацьбе супраць каланіялізма і імперыялізма ў клубе універсітэта быў праведзены «Вечар інтэрнацыянальнай дружбы». Сакратар ЦК ЛКСМБ, старшыня камітэта маладзёжных арганізацый Беларусі Генадзь Мікалаевіч Жабіцкі павіншаваў студэнтаў універсітэта са стварэннем клуба, коратка акрэсліў яго задачы. Рэдактар часопіса «Работніца і сялянка» Аляксандра Паўлаўна Ус падзялілася ўражаннямі аб сваёй паездцы ў Кітайскую Народную Рэспубліку. Студэнт V курса аддзялення журналістыкі В. Дашук расказаў аб сустрэчах з моладдзю Чэхаславакіі, якую ён наведаў у складзе групы беларускіх турыстаў.*

*Але вось на сцэну выйшлі спевакі, загучэлі песні на рускай, французскай, італьянскай, нямецкай мовах. Гэты арыгінальны канцэрт быў дадзены сіламі студэнтаў універсітэта, кансерваторыі і інстытута замежных моў.*

1 мая



Многа работы сёння ў камісіі па размеркаванню маладых спецыялістаў...

ФОТАРЭПАРТАЖ

# Ідзе размеркаванне...

*Размеркаванне... Падзея, якой чакаюць з радасцю, з хваляваннем і заміраннем, з апасеннямі і надзеяй—што ж яно прынясе!*

*Размеркаванне... Хтосьці параўняў яго з лакмусавай паперкай, якой пазнаецца сапраўдная сутнасць чалавека. Бывае студэнт і вучыцца добра, быў прызнаным камсамольскім актывістам, у ліку першых ездзіў на цаліну, але вось наступіў момант, калі ён павінен сказаць «так» або «не», і ён гаворыць «не». Значыцца ўсё было мішурой, і няма перад намі больш выдатніка і актывіста, а паяўляецца кар'ерыст і сябелюбец, які ўзяў ад дзяржавы ўсё, але нічога не жадае даць узамен.*

*Размеркаванне... Гэта сур'ёзнае для студэнта выпрабаванне, самы вялікі яго экзамен—экзамен на патрыятызм і чалавечнасць. І трэба адразу сказаць, што гісторыкі гэты экзамен вытрымалі з гонарам.*

*...Перад камісіяй па размеркаванню — Іна Ткачэнка. Дэкан гістфака Пётр Захаравіч Савачкін усміхаючыся, пытае:*

*— Што ж, Іна Фёдараўна, дзе б вы хацелі працаваць.*

*— Паеду, куды накіруюць, — не задумваючыся, адказвае дзяўчына.*



—Здаецца, цяпер мая чарга...

*— У Бярозаўскі раён Брэсцкай вобласці згодны?*

*— Згодна!*

*«Паеду, куды накіруюць» і «Так, згодна»—гэтыя адказы часцей другіх гучаць сёння. Соф'я Чымбург выбрала сабе Старобінскі раён—яна спадзяецца вучыць дзяцей беларускіх шахцёраў. Юрый Афонін ездзіў на ўборку цаліннага ўраджаю, і яму палюбіліся бяскрайнія прасторы Казахстана. Так, ён згодзен паехаць у распараджэнне ўпраўлення Чалябінскай чыгункі, згодзен працаваць у чыгуначнай школе. Не спалохалася цяжкасцяў і Марыя Капціловіч, спартсменка, выдатная гімнастка і нязменная ўдзельніца мастацкай самадзейнасці факультэта. Яна будзе працаваць у адной са школ Яраслаўскай чыгункі.*

*Натуральна былі і студэнты, якія прасілі камісію ўлічыць іх пажаданні. Юрый Кухаронак у гады вучобы захапляўся футболам, лёгкай атлетыкай. Зараз яго больш усяго цікавіць, наколькі развіты спорт у Нясвіжскім раёне. Яго супакойваюць: гарадскі пасёлак Гарадзея, куды едзе Юрый, славіцца сваімі спартсменамі на ўсю рэспубліку.*

*Ала Бакштаева ўсе гады выдатную вучобу спалучала з грамадскай працай. Яна неаднаразова выбіралася членам камітэта камсамола, актыўна ўдзельнічала ў мастацкай самадзейнасці. У яе ў Барысаўскім раёне жывуць родныя. Яна і просіць накіраваць яе на работу ў гэты раён. Камісія задавальняе просьбу Алы, і яна з радасцю распісваецца пад накіраваннем. Пайшла камісія насустрач Жану Стасенку, накіраваўшы яго ў гарадскі пасёлак Ула ў школу механізацыі, і Льву Ждановічу, пакінуўшы яго бліжэй да бацькоў—у Крупскім раёне, і многім іншым.*



На чым жа спыніць выбар...

*Аб тым, як праходзіла размеркаванне, і расказваюць гэтыя здымкі.*

А. ГАРЭЗНЫ.



—Я еду ў Чачэрск. Глядзі, вось ён...



Прыемна паставіць свой подпіс пад назначэннем...

СПОРТ

# ПРЫЗ РЭКТАРАТА—
## У нашых спартсменаў

ГЭТА эстафета, якую універсітэт штогод праводзіць у дзень нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна, стала ўжо традыцыйнай. Толькі раней да ўдзелу ў ёй запрашаліся выключна каманды ВНУ Мінска, а сёлета побач са спартсменамі-студэнтамі вышлі на старт лёгкаатлеты школ, рамесных вучылішч, буйнейшых вытворчых калектываў і тэхнікумаў.

Усе ўдзельнікі былі разбіты на 6 груп. Да першай групы аднеслі спецыялізаваныя ВНУ (інстытут фізкультуры і школа трэнераў), да другой—каманды ВНУ, да трэцяй—тэхнікумы, да чацвёртай—вытворчыя калектывы, да пятай—сярэднія школы, і да шостай—рамесныя вучылішчы.

Каб уявіць сабе, наколькі масавы характар прыняла сёлетняя эстафета, дастаткова сказаць, што заяўкі на ўдзел у ёй падалі каманды 12 ВНУ, 14 тэхнікумаў, 14 буйнейшых вытворчых калектываў, 8 рамесных вучылішч і 42 школ. Каля тысячы лёгкаатлетаў пранеслі эстафетную палачку ад помніка У. І. Леніну ля Дома ураду па вуліцы Карла Маркса да парка імя Горкага, па вуліцы Янкі Купалы выйшлі на праспект імя Сталіна і, павярнуўшы на плошчы Перамогі, працягвалі бег па праспекце імя Сталіна. Фініш, як і старт, зноў быў ля помніка Леніну.

Для пераможцаў груп было ўстаноўлена 7 пераходных прызоў — прыз гарадскога Савета саюза спартыўных таварыстваў, рэктарата універсітэта, газет «Чырвоная змена» і «Фізкультурнік Беларусі», гарана, Гаркома камсамола.

Перад пачаткам спаборніцтваў адбылося іх урачыстае адкрыццё. Парад лёгкаатлетаў прымаў галоўны суддзя, рэктар універсітэта А. Н. Сеўчанка. Ён вітаў удзельнікаў эстафеты і пажадаў ім спартыўных поспехаў. Пасля спартсмены палажылі кветкі ля падножжа помніка У. І. Леніну.

Пераможцамі спаборніцтваў сярод школ сталі юныя спартсмены СШ № 42. У рамеснікаў перамаглі бегуны вучылішча № 25, сярод тэхнікумаў першынства заваяваў электратэхнікум сувязі, уладальнікам прыза для каманд вытворчых калектываў сталі спартсмены трактарнага завода.

Асаблівую цікавасць выклікаў апошні забег, у якім стартавалі спартсмены вышэйшых навучальных устаноў і спецыялізаваных ВНУ. Асноўная барацьба, як і меркавалася, разгарэлася паміж першай камандай інстытута фізкультуры і бегунамі нашага універсітэта. Першы этап ад каманды інстытута фізкультуры бяжыць першаразраднік Лабус. Навічок у лёгкай атлетыцы студэнт II курса юрфака Князюк мужна змагаецца з ім, але вымушаны ўступіць вопыту. Ён прайграе Лабусу метраў 8.

Але вось эстафетную палачку прымае Лаўнікові. Імклівы і лёгкі бег студэнткі хімфака. Яна не толькі выводзіць нашу каманду на першае месца, але і выйграе метраў пяць.

Трэці этап. Семянюк зрабіў усё, што было ў яго сілах, аднак бягун інстытута фізкультуры Фішаровіч аказаўся мацнейшым. Калі Тамара Сахацкая прымала эстафету, майстар спорту Зарэцкая (ІФК) была ўперадзе яе прыкладна на 25 метраў. Нягледзячы на гэта, Тамара дастае яе, абыходзіць і выйграе метраў дзесяць.

На пятым этапе Кузнечык перадае эстафетную палачку амаль разам з прадстаўніком ІФК. І толькі на шостым этапе больш вопытныя бегуны інстытута фізкультуры здолелі апярэдзіць нашу каманду.

Такім чынам, інстытут фізкультуры стаў уладальнікам прыза для спецыялізаваных ВНУ. А лёгкаатлеты універсітэта заваявалі прыз рэктарата для каманд вышэйшых навучальных устаноў.

В. КУШНАРОЎ.

# СТАРТУЕ СЕЗОН ФУТБОЛЬНЫ

Нашы футбалісты пачалі інтэнсіўныя трэніроўкі яшчэ зімой. Перад спаборніцтвамі на прыз адкрыцця сезона каманда правяла дзве кантрольныя сустрэчы. Яна дабілася пераканаўчай перамогі над футбалістамі будтрэста № 19 і ўзяла верх у сустрэчы з камандай інстытута народнай гаспадаркі (3:0). Гэта дазволіла выявіць ігракоў, якія ўвайшлі ў склад першай каманды універсітэта.

24 красавіка адбыўся бліц-турнір сярод футбольных каманд ВНУ Мінска. Першую гульню з Лесатэхнічным інстытутам наша каманда выйграе з лікам 2:0.

Нялёгка давялося нашым спартсменам у сустрэчы з футбалістамі Інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. У эстафеце лепшы час быў у нас, і гэта напэўна крыху расслабіла ігракоў. У выніку ў першай палавіне мяч двойчы пабываў у сетцы нашых варот.

Адчуўшы пагрозу паражэння, нашы спартсмены мабілізоўваюць усе свае сілы. Іх атакі хваля за хваляй ідуць на вароты сапернікаў. Нашы фарварды ўсё часцей прарываюцца на штрафную пляцоўку механізатараў. Лік становіцца 2:1, 2:2 — і наша каманда выходзіць у фінал.

У фінале нашымі сапернікамі сталі футбалісты палітэхнічнага інстытута, адны з мацнейшых у рэспубліцы. Аднак, наша каманда не разгубілася перад грозным праціўнікам. Пры поўнай ігравой перавазе футаблістаў універсітэта прайшоў увесь першы тайм. Толькі памылкі нападаючых не дазволілі адкрыць лік. Нашу каманду задавальняе і нічыя. (лепшы час у эстафеце). Відаць, гэта сказалася на яе гульні ў другім тайме. Забыўшы, што лепшая абарона — гэта нападзенне, нашы футбалісты амаль перасталі атакаваць і перайшлі ў абарону. Цяпер ужо палітэхнікі ўсё часцей і часцей абстрэльваюць нашы вароты. Грубая памылка нашага абаронцы — і за 4 мінуты да канца сустрэчы ім удаецца забіць адзіны гол. Ён і вырашыў зыход сустрэчы.

Такім чынам, ігры на прыз адкрыцця сезона сярод каманд ВНУ паказалі, што нашым спартсменам трэба яшчэ больш настойліва трэніравацца, рыхтуючыся да рашаючых баёў на футбольных палях.

В. КАВАЛЕЎСКІ.

# Поспехі шашыстаў

У першынстве Беларусі па шашках сярод жанчын вялікага поспеху дабілася студэнтка 3-га курса матэматычнага факультэта Ліля Лесіна. З бліскучым вынікам—12,5 ачка з 13 магчымых—Л. Лесіна заваявала ганаровае званне чэмпіёнкі рэспублікі і выканала норму 1-га спартыўнага разраду.

У першынстве гарадскога савета ДСТ «Буравеснік» па шашках вялікі поспех выпаў на долю студэнта 4-га курса матэматычнага факультэта Генадзя Драбушэвіча. Набраўшы 7,5 ачка з 10 магчымых, малады першаразраднік заваяваў званне чэмпіёна сталіцы сярод студэнтаў.

Студэнт 5-га курса матэматычнага факультэта Уладзімір Комлік і студэнт 5-га курса фізічнага факультэта Яўген Верцель, набраўшы па 6,5 ачка, выканалі на гэтых спаборніцтвах норму 1-га спартыўнага разраду.

М. ГЕЛЕР.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

АТ 06897 Зак. 859 Друкарня выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна. Тыраж 2000 экз.